Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ВЕРАСНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 169 (27534) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«Пенсійная сістэма — гэта страхавая сістэма, якая мае пэўныя ўмовы для ўступлення і для атрымання выплат. Таму пяцігадовы перыяд працоўнага стажу вельмі малы...» СТАР 2

За кошт таго, што «Картка навучэнца» з'яўляецца паўнавартаснай аплатнай карткай буйнейшай фінансавай установы краіны, у школьнікаў з'яўляецца магчымасць разлічвацца з яе дапамогай у школьных сталовых, буфетах. СТАР 5

...Такіх прывабных рэчаў побач было шмат – ручнікі, посцілкі, спадніцы, андаракі... Усё прывезена з экспедыцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства ў Горацкі раён Магілёўскай вобласці. СТАР 6

ВЫЗНАЧАНЫ ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ 2012 ГОДА

Лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2012 года сталі 16 чалавек. Указ №401 «Аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2012 года» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 9 верасня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Указам прысуджаны тры прэміі ў галіне навукі і тэхнікі і тры прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за работы, якія характарызуюцца навуковай навізной і маюць значную эканамічную эфектыўнасць ці сацыяльную значнасць для Беларусі, а таксама атрымалі шырокае прызнанне беларускай і міжнароднай грамадскасці.

Дзяржаўнай прэміяй **у галіне навукі і тэхнікі** адзначаны цыкл работ «Новыя неарганічныя злучэнні і матэрыялы на аснове мікра- і нанаразмерных часцінак: атрыманне, уласцівасці, прымяненне» . Ён мае высокую навуковую каштоўнасць і змяшчае вынікі сусветнага ўзроўню навізны, атрыманыя за 35-гадовы перыяд даследаванняў. Аўтарамі Міхаілам Арцем'евым, Анатолем Лесніковічам і Алегам Івашкевічам упершыню сінтэзаваны больш за 100 новых злучэнняў, якія знайшлі прымяненне ў розных галінах і ў розных краінах свету.

Гэтай прэміі таксама ўдастоена праца «Распрацоўка і шырокамаштабнае ўкараненне нацыянальных сродкаў абароны дакументаў, каштоўных папер і асабліва каштоўных аб'ектаў на аснове галаграфічных метадаў». Аўтарамі Леанідам Таніным, Пятром Маісеенкам і Мікалаем Макарэвічам распрацаваны і ўкаранёны нацыянальныя надзейныя сродкі абароны ад падробкі каштоўных папер, якія маюць сусветны прыярытэт. Навуковая каштоўнасць гэтай работы заключаецца ў развіцці фізічных прынцыпаў і распрацоўцы ўнікальных галаграфічных тэхналогій, якія з'яўляюцца бясспрэчным дасягненнем беларускіх вучоных і інжынераў.

Акрамя таго, дзяржаўнай прэміяй у галіне навукі і тэхнікі заахвоцілі працу «Распрацоўка і асваенне вытворчасці спецыяльных колавых шасі і цягачоў чацвёртага пакалення ваенна-тэхнічнага і двайнога прызначэння». Аўтары працы Андрэй Галавач, Юрый Нікалаеў і Яўген Гарко стварылі аснову для арганізацыі ў Беларусі ўласнай вытворчасці спецыяльных колавых шасі і цягачоў, якія істотна пераўзыходзяць па сваіх характарыстыках машыны папярэдняга пакалення.

Дзяржпрэміяй **у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры** адзначаны спектакль «Пінская шляхта» па п'есе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Творчы калектыў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы стварыў спектакль, які стаў выдатнай з'явай у тэатральным жыцці краіны і ўяўляе сабой яркае ўвасабленне класікі сучаснымі сцэнічнымі сродкамі. Гэтая пастаноўка атрымала высокую ацэнку і прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Прэмія прысуджана народнаму артысту Беларусі Віктару Манаеву, мастаку-пастаноўшчыку Вользе Мацкевіч і кампазітару Андрэю Зубрычу.

За выдатныя дасягненні вакальнага і выканаўчага майстэрства дзяржаўнай прэміі ўдастоена артыст-вакаліст — вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Ніна Шарубіна. Артыстка, якая валодае голасам рэдкага тэмбру, за кароткі час стала вядучай салісткай тэатра оперы і балета, дэманструючы цудоўны вакал, віртуозную пеўчую тэхніку і талент драматычнай актрысы. Яе творчасць з'яўляецца вышэйшым дасягненнем беларускага мастацтва апошняга часу.

Дзяржаўнай прэміяй за стварэнне шматпрофільнага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» адзначаны аўтарскі калектыў у складзе Валерыя Куцко, Уладзіміра Будаева і Анатоля Шабаліна, які стварыў найбуйнейшы спартыўна-культурны аб'ект на тэрыторыі краіны, што па сваім маштабе, інжынернаму і мастацкаму вырашэнню параўнальны з найлепшымі ўзорамі сучаснай сусветнай архітэктуры.

Прыняцце ўказа сведчыць пра высокую ацэнку і прызнанні дзяржавай заслуг выдатных людзей Беларусі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё нацыянальнай навукі, культуры і мастацтва.

■ Этнапрастора

Фота БЕЛТА.

«КАМЯНІЦА»: СВЯТА, НА ЯКІМ ХОЧАЦЦА ЎСІХ АБНЯЦЬ

Усю дарогу да музея народнай архітэктуры і побыту здзіўленыя бабулькі-дачніцы з цікаўнасцю паглядалі ў аўтобусе на апранутых у вышыванкі маладых людзей, якія гаманілі паміж сабой па-беларуску і спявалі народныя песні. Пэўна, думалі, што едуць нейкія артысты. Некаторыя пасажыры з веданнем справы пыталіся: «Вы на фестываль едзеце?» Зрэшты, апазнаць наведнікаў фэсту можна было і без «асаблівых прыкмет»: нешта няўлоўнае выдавала ў іх «камянічнікаў»...

Сёлета штогадоваму фолк-фестывалю «Камяніца», які яднае музычныя традыцыі розных краін, споўнілася пяць гадоў. З гэтай нагоды арганізатары загадзя абвясцілі: фэст будзе доўжыцца не адзін, як звычайна, а два дні. Але сюрпрыз, як аказалася, быў далёка не для ўсіх: трапіць на «Сяброўскую вячэру», што праходзіла ў першы фестывальны дзень, можна было выключна па запрашальніках. Мерапрыемства апраўдала сваю назву: з самага пачатку гасцей частавалі рознымі прысмакамі і напоямі. Пасля таго, як арганізатары абвясцілі адкрыццё фэсту, адбыліся майстар-класы па прыгатаванні страў беларускай кухні: дранікаў (чамусьці не бульбяных, а гарбузовых) і верашчакі, якія можна было пакаштаваць. Упершыню мне выпала пачаставацца і традыцыйным гарачым напоем з зёлак і мёду — збітнем. Духмяны і вітамінны, ён аказаўся вельмі прыемным на смак. СТАР 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінгарвыканкама:

«Неабходна паставіць задачу кіраўнікам прадпрыемстваў забяспечыць ахоп вакцынацыяй супраць грыпу ў сярэднім 50% работнікаў. Формы арганізацыі гэтай працы павінны быць гнуткімі, магчымая частковая аплата вакцыны работнікам. Гэта задача ў тым ліку і эканамічнага характару, якую мы абавязаны выканаць».

ПРАМАЯ ЛІНІЯ МУС

ВЫ Ў ПАРАДКУ?

На вашы пытанні, звязаныя з асабістай і маёмаснай бяспекай, ахоўнымі паслугамі, бяспекай дарожнага руху, своечасовым рэагаваннем на паведамленні аб правапарушэннях, грамадскім парадкам і прафілактыкай злачынстваў адкажа **намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі генерал-маёр міліцыі Мікалай Аляксандравіч МЕЛЬЧАНКА.** «Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца ў Міністэрстве ўнутраных спраў **11 верасня,** у сераду, **з 11.00 да 12.00** па нумары: **(8-017) 218 55 30**.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.09.2013 г.

Долар ЗША	9030,00	▼
Еўра	11900,00	▲
Рас. руб.	271,00	▲
Укр. грыўня	1105,94	▲

ДЗЕЙНІЧАЦЬ ЗГОДНА З АДЗІНЫМ ПЛАНАМ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 9 верасня сустрэўся з генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалаем Бардзюжам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі да маючай адбыцца 23 верасня ў Сочы сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, а таксама беларуска-расійскага сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2013».

«Я хацеў бы з вамі абмеркаваць шэраг пытанняў, якія, упэўнены, вас цікавяць. Гэта сустрэча кіраўнікоў дзяржаў АДКБ, якая адбудзецца ў апошняй дэкадзе верасня. І практычна ў гэты ж перыяд пройдзе вучэнне «Захад-2013», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што хацеў бы пачуць меркаванне Мікалая Бардзюжы, а таксама кіраўнікоў дзяржаў, з якімі той сустракаўся, іх рэакцыю на ўсе актуальныя праблемы.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Апошнім часам у нас вельмі шмат інфармацыйных і іншых пытанняў у беларуска-расійскіх адносінах. Я гатовы абмеркаваць з вамі пытанні, якія могуць узнікаць у сувязі з гэтым, таму што апошні месяц выйшаў ужо занадта бурны ў нашых адносінах, маса непаразуменняў у гэтым плане, і я хацеў бы вас праінфармаваць і пачуць вашы ацэнкі». СТАР 2

■ Чалавек робіць, а зямля родзіць

СВАЁ — ЗНАЧЫЦЬ ЛЕПШАЕ?

Некаторыя яшчэ ўчора экзатычныя для Беларусі сельгаскультуры становяцца даволі папулярнымі як у адпаведных прадпрыемстваў, так і ў фермераў, не кажучы пра прысядзібныя ўчасткі. Тыповы прыклад: добра знаёмы і многімі любімы з-за сваіх смакавых і асабліва лекавых якасцяў кавун набывае сталую прапіску на нашых палях. Пакуль што мы яго спажываем свежым, а ёсць жа і сок кавуновы, і кавун сушаны, і кавун салёны, і мочаны... Старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі аграхіміі і харчавання раслін Інстытута агародніцтва кандыдат сельскагаспадарчых навук Андрэй Бадзько лічыць кавун для нашай краіны стратэгічнай культурай.

Кавун — трэці хлеб?

— Гэта не перабольшванне, бо кавун, у адрозненне ад большасці культур, не патрабуе ўрадлівых глебаў. А ў нас, асабліва на поўдні і паўднёвым захадзе краіны, у Гомельскай і Брэсцкай абласцях, такіх пясчаных і лёгкіх земляў хапае. На іх складана атрымліваць добрыя ўраджаі іншых культур, ды і кліматычныя ўмовы там для вырошчвання кавуноў у адкрытым грунце даволі спрыяльныя. Першымі такую магчымасць заўважылі фермеры і гаспадары прысядзібных участкаў, якія пачалі разводзіць кавуны на невялікіх плошчах. З 2007 года гэтую тэматыку пачаў весці наш інстытут, і да 2011 года была ўжо распрацавана тэхналогія вырошчвання. СТАР 5

Фота БЕЛТА.

■ Надвор'е

ЦЁПЛА. І «ГРЫБНЫЯ» ДАЖДЖЫ...

Гэтымі днямі надвор'е ў Беларусі пагоршыць больш вільготнае паветра, што рухаецца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.

Такім чынам, у аўторак чакаецца воблачнае надвор'е, калі месцамі па Брэсцкай, Гродзенскай і Віцебскай, а таксама па захадзе Мінскай вобласці пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень плюс 17-23 градусы. Даволі цёплае і няўстойлівае надвор'е захаваецца ў нас у сераду і чацвер. Таму месцамі будуць ісці кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы 7-13 цяпла, удзень плюс 16-22 градусы.

Паводле папярэдніх разлікаў айчынных спецыялістаў, з пятніцы і на выхадныя на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць больш вільготнае паветра з боку Міжземнага мора. Таму ў гэтыя дні амаль паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы сярэдняй інтэнсіўнасці. Уначы стане яшчэ цяплей — 9-14, удзень будзе плюс 13-18 градусаў, а па паўночным захадзе пры праясненнях да 19-22 цяпла.

Сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны фон прыкладна на 2-3 градусы вышэйшы за кліматычную норму. Паводле слоў Людмілы Парашчук, менавіта таму пра «бабіна лета» гаварыць сёння зарана. Будзем чакаць яго ў другой палове верасня ці ў першай дэкадзе кастрычніка.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БРЫТАНСКІ ПРЭМ'ЕР ПАКІНУЎ БЕЗ НАГЛЯДУ САКРЭТНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран, як мяркуецца, пакінуў адкрытым і без нагляду свой міністэрскі кейс з сакрэтнымі дакументамі. Неназваны грамадзянін у цягніку Лондан-Эдынбург, у якім таксама знаходзіўся Кэмеран, зрабіў фотаздымак. На ім відаць так званы чырвоны чамаданчык з надпісам «прэм'ер-міністр». Такія кейсы выкарыстоўваюцца для транспартавання сакрэтных рабочых дакументаў. На здымку відаць, што чамаданчык ляжыць на стале без нагляду, пры гэтым у замок устаўлены ключ. Згодна са спецыяльнай інструкцыяй, якая выйшла ў 1999 годзе, міністры і прэм'ер-міністр абавязаны гарантаваць канфідэнцыяльнасць сакрэтных рабочых дакументаў, якія знаходзяцца ў кейсе, калі яны выкарыстоўваюць грамадскі транспарт.

МАСКВІЧЫ ВЫБРАЛІ САБЯНІНА, НАВАЛЬНЫ ПАТРАБУЕ ДРУГІ ТУР

Масквічы 8 верасня выбіралі кіраўніка горада на бліжэйшыя пяць гадоў. Паводле звестак Масгарвыбаркама, часовы выканаўца абавязкаў мэра сталіцы Сяргей Сабянін выйграе выбары ў першым туры, набраўшы больш за 50% галасоў выбаршчыкаў. Сабянін пасля падліку 100% пратаколаў набраў 51,37%, Аляксей Навальны — 27,24%. Камуніст Іван Мельнікаў набраў 10,69%, лідар «Яблыка» Сяргей Мітрохін — 3,51%, дэпутат Дзярждумы ад ЛДПР Міхаіл Дзегцяроў — 2,86%, кандыдат ад «Справядлівай Расіі» Мікалай Левічаў — 2,79%. Яўка на выбарах мэра Масквы склала 32,07%. У сваю чаргу Аляксей Навальны ўжо адмовіўся прызнаваць папярэднія вынікі і заявіў, што выбары павінны прайсці ў два туры.

У ТУРЦЫІ ЎЗЯЛІСЯ ЗА ТАКСІСТАЎ

У Турцыі звольнілі больш за пяць тысяч таксістаў, якія маюць крымінальнае мінулае. У Стамбуле наўрад ці знойдзецца чалавек, якога не падманвалі ў таксі. Фальшывыя квіткі, няправільная рэшта, рабаванні — кожны год улады сталіцы атрымліваюць тысячы скаргаў ад падманутых пасажыраў. Нядаўна ў горадзе вырашылі пакласці канец падобным здарэнням. Цяпер пры ўладкаванні на працу таксістам кандыдаты абавязаны прад'яўляць даведку аб адсутнасці судзімасці. Вынікі не прымусілі сябе доўга чакаць. За апошні час сярод больш чым дзвюх тысяч скаргаў на таксістаў не было ніводнай заявы аб крадзяжы, падмане або грубасці. 85% скаргаў паступалі з-за таго, што таксісты проста адмаўляліся везці пасажыра, матывуючы гэта тым, што адлегласць была занадта кароткай.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ААН НАЗВАЛА САМЫЯ ШЧАСЛІВЫЯ КРАІНЫ СВЕТУ

ААН апублікавала рэйтынг самых шчаслівых краін свету. Верхнія радкі рэйтынгу занялі Данія, Нарвегія, Швейцарыя, Нідэрланды і Швецыя. Усяго ў рэйтынгу 150 краін. У якасці ацэначных крытэрыяў эксперты абралі шэсць фактараў: рэальны ВУП на душу насельніцтва, працягласць здаровага жыцця, магчымасць спадзявацца на каго-небудзь у найбліжэйшым акружэнні, суб'ектыўная ступень свабоды ў прыняцці жыццёвых рашэнняў, абароненасць ад карупцыі і шчодрасць.

У першую дзясятку шчаслівых краін трапілі таксама Фінляндыя, Канада, Аўстрыя, Ісландыя і Аўстралія. У другім дзясятку — ЗША і Новая Зеландыя, замыкае яго Венесуэла. З краін СНД у спісе Малдова, Казахстан, Туркменістан, Узбекістан, Беларусь, Расія. Як і летась рэйтынг замыкаюць краіны Афрыкі — Гвінея, Танзанія, Руанда, Бурундзі, Цэнтральная Афрыканская Рэспубліка, Бенін і Тога.

КОРАТКА

У Сірыі яшчэ застаюцца каля 80 грамадзян Беларусі, паведамілі ў МЗС Беларусі. Калі хто-небудзь з астатніх грамадзян выкажа жаданне вярнуцца ў Беларусь, то будзе аказана неабходнае садзейнічанне.

У Беларусі дзеянне тэлефона даверу па праблемных пытаннях у будаўніцтве падоўжана да канца верасня 2013 года. Рашэнне аб падаўжэнні прынята ў сувязі з вялікім патокам зваротаў грамадзян са скаргамі, якія паступаюць з усіх рэгіёнаў краіны.

Расійскія ваенныя з падраздзяленняў Заходняй ваеннай акругі адправіліся ў Беларусь на сумеснае вучэнне «Захад-2013». На тэрыторыю Беларусі адправіцца 2,5 тыс. расійскіх ваеннаслужачых.

Дзіцячыя крэслы зберагліі гадавалых двайнят у сур'ёзнай аварыі ў Мінску на вуліцы Баброўскай. Аўтамабіль «Сітраен» з двума дзецьмі не саступіў дарогу «Фольксвагену» і ў выніку моцнага ўдару перакуліўся на дах. У такой аварыі абышлося без пацярпелых. Дзіцячыя крэслы надзейна ўтрымалі двайнят, абодва кіроўцы былі прышпіленыя рамянямі бяспекі.

ЦІ ЛЕГКА ВЫ ПРЫЗВЫЧАІЛІСЯ ДА СТУДЭНЦКАГА РЫТМУ ЖЫЦЦЯ?

Ірына СТАРАВОЙТАВА, педагог-арганізатар у дзіцячым доме № 7, г. Мінск:

— Прывыкла дзесьці за месяц: і веды, якія атрымлівала на занятках, сталі нармальна ўспрымацца, і з аднакурснікамі за гэты час больш-менш «скантактавалася». Толькі вось ісці на першыя лекцыі чамусьці было страшнавата: не ведаеш, якая цябе чакае атмасфера, што давядзецца вучыць. Мне не прыйшлося пераязджаць ад бацькоў — гэта, безумоўна, плюс.

Але не думаю, што аднакурсніцы, якія прыехалі на вучобу ў сталіцу, надта пакутавалі з-за таго, што разлучыліся з домам. Хадзілі па дыскатэках, весяліліся. Для іх першы месяц вучобы хутчэй прайшоў не «ў стрэсе», а «на драйве».

Святлана КРЫСЕНКА, студэнтка 3 курса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:

— Адаптавацца да жыцця ў новым горадзе і вучобы ва ўніверсітэце мне, відаць, было прасцей, чым астатнім. Тут ужо вучылася мая сястра, і я нават пасяліласа з ёй у адным пакоі студэнцкага інтэрната. Зразумела, пытанні з харчаваннем і побытам «адпалі» адразу. Праўда, без цяжкасцяў усё ж не абышлося. Калі сустрэлася са сваімі будучымі аднагрупнікамі, крыху пачала нерваваца: мы ўсе вельмі розныя, і невядома, ці добра складуцца ў нас стасункі. Яшчэ, як і многія першакурснікі, я была ўражана першай лекцыяй: занатоўваць амаль нічога не паспявала, што з усяго запісанага пасля вучыць — невядома. Першы занятак па анатоміі — гэта нешта! Не, я не спужалася паходу ў «анатамічку» і вывучэння ўсіх «экспанатаў» у ёй, мяне прывёў у шок аб'ём хатняга задання.

Юлія БАРКОЎСКАЯ, менеджар-эканаміст, г. Мінск:

— Вучоба ва ўніверсітэце не была для мяне неймавернай нагрузкай, да якой трэба было прывыкаць. Можна сказаць, стаўшы студэнткай, я проста чарговы раз нырнула ў жыццёвы вір, у якім круцілася заўжды. Памятаю, што на першым курсе, акрамя наведвання заняткаў, паспявала яшчэ і на фітнэс, а па выхадных хадзіла на плаванне. Што датычыць побыту, то я студэнткай жыла ў Мінску з бацькамі. А вось аднакурснікі з іншых гарадоў сапраўды вучыліся жыць самастойна, па-новаму, і не заўжды гэта было лёгка. Таму часам нехта з «самастойных» сяброўак запрашаўся на вячэру ці прыходзіў пераначаваць, калі неабходна.

Падрыхтавала Ганна ГАРУСТОВІЧ.